PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
# ВОПЫТ, МЕТОДЫКА І ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
# І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Электронны зборнік навуковых артыкулаў
IV міжнароднай навуковай канферэнцыі
да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта

(Полацк, 19–20 красавіка 2018 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А. І. Корсак

Наваполацк
ПДУ
2018

PolotskSU

УДК 94(476)(082)
ББК 63.3(4Беи)я43

Рэдакцыйная калегія: д-р гіст. навук, праф. Д. У. ДУК;
канд. гіст. навук, дац. В. В. ДАНІЛОВІЧ;
чл.-кар. НАН Беларусі, д-р гіст. навук, праф. М. Ф. ПІЛІПЕНКА;
канд. гіст. навук, дац. А. І. КОРСАК (адк. за вып.);
канд. гіст. навук, дац. В. А. ЕМЯЛЬЯНЧЫК;
канд. гіст. навук, дац. У. А. ЛОБАЧ

Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў [Электронны рэсурс] : электрон. зб. навук. арт. IV міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацк, 19–20 крас. 2018 г. / Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт ; пад агул. рэд.: А. І. Корсак. – Наваполацк, 2018. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).
ISBN 978-985-531-617-7.

*Выдаецца з 2018 года (у друкаваным выглядзе – з 2004 г.)*

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы IV міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў». Прадстаўлены вынікі археалагічных, антрапалагічных і этнаграфічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).
Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, мовазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, мастацтвазнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

Зборнік уключаны ў Дзяржаўны рэгістр інфармацыйных рэсурсаў. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 3031816593 ад 08.10.2018.

Дызайн вокладкі *У. А. Крупеніна*
Тэхнічнае рэдагаванне *Т. А. Дар'янавай, В. П. Міхайлавай*
Камп'ютарная вёрстка *Д. М. Севасцьянавай*

211440, вул. Блахіна, 29, г. Наваполацк, Беларусь
тэл. 8 (0214) 39 40 46, e-mail: a.korsak@psu.by

ISBN 978-985-531-617-7 © Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2018

PolotskSU



УДК 94 (476)

# ДЗЕЙНАСЦЬ ЗАМЕЖНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ПА ХАРЧАВАННІ БЕЖАНЦАЎ ПАВОЛЖА Ў САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ (1921–1923 гг.)

*Г.Х. БАЗАРЭВІЧ*
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава

*З пачаткам харчовага крызісу ў Паволжы міжнародная супольнасць адгукнулася на заклікі аб аказанні дапамогі. Савецкая Беларусь узяла шэфства над галадаючымі Саратаўскай губерні, у прыватнасці, над тэрыторыяй Аўтаномнай Нэспублікі немцаў Паволжа. Дапамога прадугледжвала не толькі накіраванне грашовых сродкаў, прадуктаў харчавання і медыцынскіх брыгад, але і прыём бежанцаў. Забяспечыць вялікую хвалю галадаючых, якія прыбывалі ў Савецкую Беларусь, а таксама Віцебскую і Гомельскую губерні РСФСР, было даволі складана. Адной з самых значных крыніц забеспячэння галадаючых, у першую чаргу – дзяцей, стала замежная дапамога.*

*Ключавыя словы:* *замежныя арганізацыі, харчовы крызіс, галадаючыя Паволжа, Савецкая Беларусь, Віцебская і Гомельская губерні РСФСР.*

З пачаткам харчовага крызісу ў Паволжы, міжнародная супольнасць адгукнулася рэакцыяй на заклікі аб дапамозе. Савецкая Беларусь узяла шэфства над галадаючымі Саратаўскай губерні, у прыватнасці, тэрыторыяй Аўтаномнай рэспублікі немцаў Паволжа. Такое апякунства заключалася не толькі ў мэтавай адпраўке грошай, харчавання і медыцынскіх атрадаў, але і прыёме бежанцаў. Забяспечыць буйную хвалю пацярпелых ад голаду, што прыбывалі ў БССР, а таксама Віцебскую і Гомельскую губерні РСФСР, было досыць складана. Адной з самых значных крыніц забеспячэння галадаючых, у першую чаргу – дзяцей, стала замежная дапамога.

Пачатак удзелу замежных арганізацый у харчаванні пацярпелых ад голаду ў Паволжы можна лічыць са звароту ў ліпені 1921 г. Максіма Горкага да сусветнага грамадства. Адным з першым адгукнуўся міністр гандлю ЗША Герберт Гувер, і ў жніўні 1921 г. у Рызе была падпісаная дамова аб аказанні дапамогі 1 млн. галадаючых дзяцей. Асновай гэтага пагаднення сталі наступныя ўмовы: вызваленне амерыканскіх вязняў з савецкіх турмаў, самастойная арганізацыя працы АРА на савецкіх тэрыторыях, якая ўключала ў сябе падбор персаналу, размеркаванне дапамогі. Савецкі бок абавязваўся забяспечваць транспарціроўку грузаў, наяўнасць складоў, аплату працы мясцовага персаналу [6; с. 281 – 286]. Адной з галоўных умоў была забарона ўсякага роду палітычнай дзейнасці: ад публічных выступаў да агучвання прыватнага меркавання. Гэта датычылася ўсіх, хто меў дачыненне да АРА.

Харчаваннем бежанцаў голаду на тэрыторыі савецкай Беларусі займаліся такія замежныя арганізацыі дапамогі, як Місія Ф.Нансена, Міжнародны рабочы камітэт і Амерыканская адміністрацыя дапамогі (American Relief Administration, ARA, далей – АРА).

PolotskSU



У пачатковы перыяд галоднай кампаніі дзейнасць місіі была накіравана на дапамогу дзецям. Першыя дзіцячыя сталовыя ў Саратаве былі адчынены ў кастрычніку 1921 г. Міжнародным Саюзам дапамогі дзецям [7, с. 237]. Адначасова дзейнасць па харчаванні дзяцей у Саратаўскай губерні пачала Амерыканская Адміністрацыя дапамогі. У лістападзе 1921 г. пайкі ад АРА атрымлівалі 166 000 дзяцей, да чэрвеня 1922 г. гэтая лічба вырасла больш чым удвая – 389 957 дзяцей атрымлівалі харчаванне ад амерыканскай місіі. Акрамя гэтага, з сакавіка 1922 г. АРА прыступіла да кармлення дарослага насельніцтва: у чэрвені 1922 г. такім чынам прадукты атрымлівалі 631 977 чалавек [7, с. 237].

Тэрыторыю Беларусі, а таксама Віцебскую і Гомельскую губерні, якія ў той час уваходзілі ў склад РСФСР цэнтральныя ўлады разглядалі яе як рэспубліку –донара для галадаючых. Вызначэнне напрамкаў працы і размеркавання атрыманых шляхам збору і адлічэння сродкаў аформілася пасля замацавання за Беларускай ССР Саратаўскай губерні. Рашэнне аб арганізацыі шэфства над галадаючымі губернямі з боку ўраджайных рэгіёнаў было прынята на IV сесіі УЦВК у кастрычніку 1921 г. З гэтага моманту практыкавалася мэтавая дапамога, такая як накіраванне харчовых і медыцынскіх атрадаў у Саратаўскую губерню, адпраўка грузаў і грошай непасрэдна ў галадаючыя рэгіёны, прыём бежанцаў і арганізацыя прытулкаў для дзяцей Паволжа ў Беларусі, забеспячэнне іх пастаянным харчаваннем, стварэнне ўмоў для развіцця і выхавання. Рабочыя адлічвалі частка заробку, удзельнічалі ў суботніках і нядзельнік, праводзіліся рэквізіцыі царкоўнай маёмасці, а з сялян збіралі ахвяраванні мукой, зернем, гароднінай і грашыма.

Па гэтай прычыне, толькі ў 1922 г. АРА змагла разгарнуць паўнавартасную працу на падкантрольных савецкім уладам тэрыторыях (у студзені 1922 – у Мінску і Віцебску, у лютым 1922 г. – у Гомелі), хоць спачатку была вымушаная абмежавацца выдачай індывідуальных адрасных пасылак, што былі аплачаныя за мяжой. Пры гэтым арганізацыі не прыйшлося заключаць асобны дагавор з БССР, паколькі беларускія ўлады не настойвалі на падпісанні асобнага пагаднення, прызнаўшы дагавор АРА з РСФСР [13, с.63]. На падставе дамоўленасці ў раён дзейнасці замежных арганізацый уключалася тэрыторыя савецкай Беларусі, а таксама Віцебская і Гомельская губерні РСФСР [10, арк. 104]. Такім чынам, праца АРА на беларускай тэрыторыі была прадстаўлена савецкім аддзяленнем і арганізацыйна ўключала ў сябе Мінскае, Гомельскае і Віцебскае падраздзяленні, занятыя канкрэтнай працай у аднайменных акругах.

Адміністрацыйны апарат, які склала АРА складаўся з некалькі аддзелаў. Мінская кантора АРА складалася з шасці аддзелаў – харчовых паставак, медыцынскага, фінансаў і маёмасці, бухгалтэрыі харчовых паставак, аддзелу заявак, аддзела складоў. Галоўны склад АРА ў Мінску знаходзіўся па Савецкай вуліцы ў доме 92, яго ахова была даручана канвою школе міліцыянераў [10, арк. 102]. Сама кантора кантралявала арганізацыйна-тэхнічны бок працы, медыцынскі аддзел займаўся арганізацыяй і інструктаваннем часовых лячэбных камісій па абследаванні дзяцей, назіраў за нормамі харчавання і каларыйнасці, сачыў за санітарным станам кухань, сталовых і персаналу, займаўся стварэннем пададдзелаў у паветах пры камітэтах дапамогі. Аддзел харчовых паставак займаўся гаспадарча-размеркавальнай працай: арганізацыяй кухань, сталовых, улікам прадуктаў і дзяцей, якім было патрэбна харчаванне. Аддзел складоў займаўся пошукам і арганізацыяй складскіх

PolotskSU



памяшканняў, прымаў грузы, займаўся транспарціроўкай харчавання ў аддаленыя паветы, планаваў маршруты дастаўкі, афармляў дамовы з прыватнымі асобамі і арцелямі на закупку прадуктаў і вырабаў. У Мінскай акрузе АРА працавала каля 100 чалавек, у лік якіх уваходзілі грузчыкі, кіроўцы, машыністкі, ахоўнікі, адміністрацыйны персанал і іншыя катэгорыі. У іншых акругах іх было крыху менш (напрыклад, у Віцебскім – 22 супрацоўніка) [13, с. 64].

Паралельна з фарміраваннем адміністрацыйнай структуры адбывалася адкрыццё сталовых, што і было непасрэднай формай дапамогі галадаючым бежанцам на тэрыторыі савецкай Беларусі.

Акрамя АРА амаль адразу да дапамогі далучыўся шэраг краін. Яшчэ ў ліпені 1921 г. Ф. Нансен упэніў нарвежскі ўрад адправіць некалькі тон сушанай рыбы ў адну з галадаючых губерняў Расіі. Аднак стварэнне самога камітэта трэба аднесці да жніўня таго ж года, калі Ф. Нансен атрымаў тэлеграму ад Густава Адора, прэзідэнта Міжнароднага Чырвонага Крыжа. Ён прасіў вучонага ўзначаліць арганізацыю агульнаеўрапейскай дапамогі пацярпелым ад голаду. 15 жніўня 1921 г. у Жэневе была склікана канферэнцыя, на якую прыбылі прадстаўнікі 13 дзяржаў і 48 арганізацый Чырвонага Крыжа [9, с.350].

Пры гэтай секцыі быў арганізаваны пададдзел Міжнароднага харчавання, які займаўся размеркаваннем і транспарціроўкай прадуктаў ад Амерыканскай адміністрацыі дапамогі і Міжнароднага саюза дапамогі дзецям. Акрамя гэтага ў яго функцыі ўваходзілі нагляд і кантроль за арганізацыяй дзіцячых сталовых, а таксама размеркаванне картак для галадаючых па кантонам.

З кастрычніка 1922 г. да чэрвеня 1923 г. Віцебскае аддзяленне АРА пастаянна забяспечвала 1751 дзіцяці ў Віцебску, Полацку, Гарадку, Лёзна, Бешанковічах, Мінскае – 5000 дзяцей у 113 дзіцячых установах, забяспечваючы 74% рацыёну апошніх [8, с. 172]. А 21 лістапада 1922 г. газета "Звязда" паведаміла аб размеркаванні АРА ў дзіцячых дамах і шпіталях прыкладна 12 500 цёплых коўдраў коштам 12-16 залатых рублёў кожнае [13, с. 64].

У аснову харчавання насельніцтва было закладзена дзіцячае меню, якое АРА распрацавала на тыдзень. Уносіць змяненні ў яго мелі права толькі ў лячэбных установах з дазволу лекара, гэта было звязана з тым, што часта пацыенты працяглы час не ўжывалі ежу і даваць ім поўную порцыю адразу было небяспечна. Такім чынам, кожнаму непаўналетняму ў тыдзень належала 28,3 г. какавы, 113, 1 г. цукру, 254, 3 г. малака, 706, 6 г. мукі, 141,3 г. бабоў, 242, 2 г. рысу, 60, 6 г. жыроў. Такі баланс харчавання забяспечваў дзіцяці ад 707 да 860 ккал у дзень.

Такога харчавання відавочна было недастаткова, таму што для нармальнага развіцця дзіцячага арганізма патрабуецца 2000-2200 ккал у суткі. Часта гэты паёк быў адзіным, таму што ўрад праз мясцовыя камісіі не мог забяспечыць усіх галадаючых. Тым не менш, пагадненне, што было падпісана ў жніўні 1921 г. утрымлівала ўмову: пайкі ад АРА будуць дадатковым харчаваннем, а не асноўным [6, с. 284].

Паралельна з гэтымі арганізацыямі працу па аказанні дапамогі пацярпелым ад бедства вёў Міжнародны працоўны камітэт дапамогі галадаючым. Ад пачатку кампаніі па ліпень 1922 г. замежныя арганізацыі ўвезлі ў губерню 3 670 232 пуды (60 120 тон) прадуктаў. Акрамя харчавання замежнымі арганізацыямі сярод насельніцтва была размеркавана вялікая колькасць рыбнага тлушчу, медыкаментаў, пасцельнай бялізны і адзення [7, с. 237].

PolotskSU



Пазіцыю партыйных уладаў Беларусі ў адносінах да замежнай дапамогі вызначала знешняя палітыка савецкай Расіі. На Х-й Усебеларускай партканферэнцыі, што адбылася ў кастрычніку 1921 г., старшыня ЦВК Беларускай ССР А.Чарвякоў адзначаў, што голад у Паволжы выкарыстоўваецца замежжам як нагоду для вяртання царскіх пазыкаў [11, арк. 10]. Аднак, падобныя адносіны дэманстраваліся ў дачыненні да краін Заходняй Еўропы, а дапамога ў забеспячэнні галадаючых з боку Злучаных Штатаў Амерыкі ацэньвалася як гуманная місія. Тым не менш, стварэнне амерыканцамі камісіі, у якую увайшлі члены ўрада, выклікала сумненні ў бескарыслівай дапамозе. Бытавала меркаванне аб тым, што падтрымка Расіі выкліканая жаданнем не дапусціць яе разбурэння і перашкодзіць умацаванню ўплыву Японіі.

Асэнсаванне мэтаў дапамогі з замежжа беларускае партыйнае кіраўніцтва прыводзіла да думкі аб размеркаванні сфераў інтарэсаў розных пластоў. Агульная выснова заключалася ў тым, што аказанне дапамогі галадаючым замежнымі арганізацыямі – гэта выражэнне зацікаўленасці ў наладжванні гандлёвых адносінаў.

У сваім выступе А. Чарвякоў згадаў, што калі падзяліць усіх замежных удзельнікаў дапамогі галадаючым Паволжа, то вылучылася тры плыні. Першай была “група сусветных імперыялістычных драпежнікаў, якія ў памкненнях узбагаціцца не ведаюць ніякіх законаў” [11, л.12]. Такія погляды былі звязаныя з вынікамі абмеркавання расійскага пытання аб галадаючых на канферэнцыі ў Брусэлі, дзе было прынята рашэнне аказаць дапамогу ў тым выпадку, калі будуць выплачаныя даўгі царскага ўрада.

Лічылася, што некаторыя ініцыятывы грамадскіх арганізацый, што дыстанцыяваліся ад урадаў сваіх краін, такія як прадстаўніцтвы АРА, некаторыя англійскія арганізацыі, шведскі Чырвоны Крыж і доктар Ф. Нансэн, дапамагаюць бескарысліва. Удзел міжнароднага інтэрнацыяналу і яго гатоўнасць да дапамогі азначала, што пападаючы пад уплыў камуністычнага ўплыву яго ўдзельнікі будуць заставацца пад ім і пры вырашэнні іншых пытанняў.

Урад ЗША ўстрымліваліся ад збліжэння з савецкай Расіяй, але асобныя арганізацыі, такія як ініцыятыва міністра гандлю Герберта Гувера аказвала галадаючым значную дапамогу. Тое ж самае назіралася ў Англіі. Гэта тлумачылася тым, што ўнутры гэтых дзяржаў дзейнічалі розныя плыні, якія пераследавалі свае мэты – уключыць Расію ў гандлёвыя стасункі і тым самым знайсці рынкі збыту.

Пасля распараджэння аб ліквідацыі органаў па ліквідацыі наступстваў голаду ў Паволжы замежныя арганізацыі з іх апаратам былі скасаваныя да 1 жніўня 1923 г. Да гэтага часу дапамога павінна была ажыццяўляцца праз павятовыя дзіцячыя камісіі, аддзелы адукацыі, аховы здароўя, камісіі дапамогі інвалідам, эканамічныя аддзелы і органы садзейнічання сельскай гаспадарцы [5, л. 16]. Размеркаванне медыкаментаў ад АРА у савецкай Беларусі адбывалася строга з рэгламентаванымі правіламі, абодва бакі адказна кантралявалі гэты працэс [10, л.14].

На тэрыторыі савецкай Беларусі дзейнічалі правілы бяспошліннага пропуску прыбываючых грузаў з-за мяжы на адрас ЦК Памагол, а пазней ЦК Паследгол, Чырвонага Крыжа і дабрачынных арганізацый харчавання, прадметаў шырокага спажывання і іншых грузаў. З восені 1921 г. па 1923 г. у савецкай Беларусі знаходзіліся прадстаўніцтвы розных замежных арганізацый:

PolotskSU



1. Амерыканская Адміністрацыя дапамогі (АРА);
2. Тред – Юніоны (Велікабрытанія);
3. Міжнародная дапамога Расіі працоўнымі;
4. Галандскія і амерыканскія менаніты;
5. Французскі Чырвоны Крыж;
6. Каталіцкая місія;
7. Харбінскі грамадскі камітэт;
8. Джойнт;
9. Бліжнеўсходні камітэт дапамогі;
10. Згуртаванне сяброў "Квакеры";
11. Міжнародны саюз дапамогі дзецям;
12. Амерыканская менаніская дапамога;
13. Міжнародны камітэт дапамогі галадаючым пад кіраўніцтвам Ф. Нансена, у які ўвайшлі наступныя арганізацыі: Швейцарскі камітэт дапамогі дзецям; Універсальная Еўрапейская канферэнцыя дапамогі; Сербска-Харвацкі-Славенскі Камітэт;Еўрапейская даамога студэнцтву; Швейцарскі Чырвоны Крыж; Дацкі Чырвоны Крыж; Італьянскі Чырвоны Крыж; Камітэт Нансена ў Амстердаме; Германскі Чырвоны Крыж; Галандскі Чырвоны Крыж; Нарвежскі чырвоны Крыж; Швецкі Чырвоны Крыж.

Бедства мела водгук і ў еўрапейскіх краінах. Германскае ўрадавае паведамленне аб аказанні дапамогі галадаючым у Паволжы абмяркоўвалася ўсімі газетамі. Выданне камуністычнай арыентацыі "Чырвоны сцяг" заклікала ўсіх германскіх працоўных ісці за прыкладам ураду і на справе пацвердзіць сваю еднасць з галадаючымі працоўнымі і сялянамі Расіі, падкрэслівала неабходнасць аб'яднання працоўных і пралетарскіх партый для аказання дапамогі.

Нарвежскі ўрад яшчэ летам 1921 г. вылучыў для пацярпелых салёную рыбу, селядцы і рыбін тлушч на суму 700 тысяч крон і аплаціў кошт дастаўкі і страхавання іншага харчавання [12, с.1].

Трэба адзначыць, што ў першыя месяцы бедства дапамога прыходзіла з розных і самых аддаленых краін. У першую чаргу ад прафесійных згуртаванняў камуністычнай арыентацыі. Так, да 24 жніўня 1921 г. брытанскай імператарскай арганізацыяй было сабрана больш за 1 мільён фунтаў стэрлінгаў, англійскай камуністычнай партыяй 330 фунтаў стэрлінгаў, французскай усеагульнай федэрацыяй працы сабрана каля 100 тыс. франкаў [1, с. 1]. Французская кампартыя сабрала для галадаючых Расіі 200 тыс. франкаў. У Чэхаславакіі члены ўсіх прафесійных саюзаў унеслі адлічэнні на карысць галадаючых і памер які ў верасні 1921 г. налічваў 125 тыс. чэшскіх крон. Сацыялістычная партыя Італіі сабрала 174 тыс. лір, саюз італьянскіх маракоў ахвяраваў 1 млн. лір [2, с. 1]. Члены прафсаюзаў у Варшаве стварылі працоўны камітэт дапамогі галадаючымі пастанавілі ўвесці штомесячныя адлічэнні аднаднеўнага заробку. У Лодзі працоўныя скураной прамысловасці ахвяравалі 2-дзённый заробак. Дапамога з замежжа была прадстаўлена м нехарчовымі ахвяраваннямі: працоўныя германскай фабрыкі ахвяравалі грузавы аўтамабіль (коштам 165 тыс.марак), паравоз, інструменты [4, с. 1].

Таксама меў рэзананс роспуск Усерасійскага камітэту дапамогі. Рускія эмігранцкія арганізацыі выказвалі пратэст супраць такога рашэння. Берлінская арганізацыя адмовілася ад удзелу ў нарадзе па пытанні аб бежанцах голаду [3, с. 1].

PolotskSU



Мелі месца і формы адмовы ад аказання дапамогі галадаючым Паволжа. У некаторых выпадках формы былі адкрытыя. Напрыклад, працоўныя падчас збору сродкаў сярод Арчэгаве (Сілезія) былі аштрафаваныя, а сабраныя грошы канфіскаваныя [2, с. 1]. Факт замоўчвання быў у Вене, падчас 8-га міжнароднага з'езда супрацоўнікаў друку. У якасці госця быў запрошаны прадстаўнік Усесаюзнага расійскага саюза працоўных друку. Прапанова рускага дэлегата ўключыць у парадак дня пытанне аб дапамозе галадаючым было адхілена.

Трэба адзначыць, што дапамога Міжнароднага працоўнага камітэту, місіі Ф. Нансена не насіла сістэматычнага характару. І тым не менеей, нягледзячы на гэта, нават такая нерэгулярная дапамога здолела ўратаваць не адно чалавечае жыццё.

Такім чынам, замежная дапамога галадаючым з Паволжа на тэрыторыі Беларусі была прадстаўлена шэрагам арганізацый. Сістэматычную і рэгулярную працу вяла АРА, якая забяспечвала большую частку дзіцячых дамоў не толькі дадатковым, а часта і асноўным пайком.

ЛІТАРАТУРА

1. Вести отовюду // Известия Витебского губисполкома и Губкома Р.К.П. (б). – 1921. – 11 сент. – С. 1.
2. Вести отовюду // Известия Витебского губисполкома и Губкома Р.К.П. (б). – 1921. – 14 сент. – С. 1.
3. Вести отовюду // Известия Витебского губисполкома и Губкома Р.К.П. (б). – 1921. – 15 сент. – С. 1.
4. Вести отовюду // Известия Витебского губисполкома и Губкома Р.К.П. (б). – 1921. – 25 сент. – С. 1.
5. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 95. Воп. 1. Спр. 357. Дело о ликвидации Витебской губернской комиссии по борьбе с последствиями голода и передаче подведомственных ей учреждений по борьбе с безработицей комитету биржи труда.
6. Документы внешней политики СССР. Т. 4. 19 марта 1921 г. – 31 декабря 1921 г. – М. : Госполитиздат, 1960. – 812 с.
7. Итоги борьбы с голодом 1921 – 1922 гг. : сб. ст. и отчетов. – М., 1922. – 499 с.
8. Лукашук, А. Прыгоды АРА ў Беларусі / А. Лукашук. – Мінск : Радыё свабодная Эўропа, 2005. – 500 с.
9. Нансен-Хейер, Л. Книга об отце / Л. Нансен-Хейер . – М. : Гидрометеоиздат, 1986. – 511 с.
10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 16. Воп. 1. Спр.6. О распределении медикаментов АРА в Белоруссии.
11. НАРБ. – Ф. 4. Воп.1. Спр. 418. 10-я Всебелорусская партконференція 1921 г. (стенограмма).
12. Отклики голода за границей // Известия Витебского губисполкома и Губкома Р.К.П. (б). – 1921. – 30 июля. – С. 1.
13. Саматыя, В.Р. Деятельность АРА по оказанию помощи беженцам на территории Беларуси в 1920-1923 гг. / В.Р. Саматыя // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. – 2005. – № 2. – С. 62–65.

PolotskSU



ACTIVITY OF FOREIGN ORGANIZATIONS FOR FEEDING REFUGEES FROM THE VOLGA REGION IN SOVIET BELARUS (1921 – 1923)

*G. BAZAREVICZ*

*With the onset of the food crisis in the Volga region, the international community responded response to calls for assistance. Soviet Belarus took patronage over the starving of the Saratov province, in particular, the territory of the Autonomous Republic of the Volga Germans. Such protection was not only to the target sending money, food and medical teams, but also the reception of refugees. Provide a large wave hit by the famine that came in the Soviet Belarus, as well as Vitebsk and Gomel Province of the RSFSR, it was quite difficult. One of the most significant sources of assistance become foreign participation.*

Keywords: *foreign organization, the food crisis, starving the Volga region, Soviet Belarus, Vitebsk and Gomel province of RSFSR.*